Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

АРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 9 (597) Пятніца, 9 красавіка 1965 г. Год выдання XVIII-ы Цана 1 кап.

## ДОБРЫ ДЗЕНЬ, УНІВЕРСІТЭТ!

Звычайна гавораць: «Гара з гарою не сыходзяцца, а чалавек з чалавекам...» Сустрэча з чалавекам пасля доўгага расставання, якая гэта радасць! Такая радасная, шчырая сустрэча і адбылася ў актавай зале філалагічнага корпуса. Вечар, прысвечаны традыцыйнай сустрэчы з выпускнікамі. Ён з'явіўся свайго роду аглядам таго, што зроблена факультэтам за гады свайго існавання. Яшчэ задоўга да пачатку вечара я заўважыў групку ўжо далёка немаладых людзей, якія вялі паміж сабою вясёлую гутарку. Падыходжу да іх бліжэй, знаёмлюся. Аказваецца, што гэта былыя выпускнікі універсітэта. Ніна Барысаўна Ватацы—галоўны бібліёграф дзяржаўнай бібліятэкі імя Ул. І. Леніна, закончыла універсітэт у 1931 годзе. Надзея Несцераўна Шарай—заслужаная настаўніца БССР. Надзея Несцераўна ўсё расказвае і расказвае. Колькі ў яе вучняў, якім яна дала пуцёўку ў жыццё, хіба іх можна пералічыць!..



А каму не вядома ў нашай рэспубліцы прозвішча дзіцячага пісьменніка Аляксандра Восіпавіча Пальчэўскага? Яго кніжкі «Аля і Рая», «Дым над лесам» і многа іншых вельмі падабаюцца рабятам. Аляксандр Пальчэўскі — любімы пісьменнік нашай дзетвары.

Многа было выступаючых. У ліку іх мы бачылі нашых паэтаў Алега Лойку, Ніла Гілевіча, Генадзя Бураўкіна, Івана Сіпакова. Пасля ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці універсітэта далі канцэрт. Доўга яшчэ ў гэты вечар не змаўкаў у зале смех, музыка. Я папрасіў студэнтку першага курса аддзялення рускай мовы і літаратуры Валю Сіманаву падзяліцца ўражаннямі вечара:



— Я вельмі ўсхвалявана тым, што ўбачыла. Мне было прыемна пазнаёміцца з нашымі пісьменнікамі, настаўнікамі, журналістамі, якія раней вучыліся ў сценах універсітэта. Хочацца і самой быць падобнай на іх. А для гэтага трэба вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца. Што ж пажадаем табе, Валя, і многім тваім сяброўкам поспехаў ў вучобе. Прымі гэтую слаўную эстафету старэйшага пакалення універсітэта і пранясі яе з гонарам праз усё жыццё.

В. АДЗІЯН,
загадчык адзела культуры і быта пры газеце.

НА ЗДЫМКАХ: (уверсе) — беларускі паэт А. Лойка падпісвае сваю кніжку студэнту; (унізе)—піянеры універсітэта—пісьменнік А. Пальчэўскі, галоўны бібліёграф дзяржаўнай бібліятэкі імя Ул. І. Леніна—Н. Ватацi, заслужаная настаўніца БССР Н. Шарай.

## СЛОВА КАМСОРГАМ

**Семінар сакратароў камсамольскіх арганізацый курсаў.**

Нядаўна ў камітэце камсамола праходзіў семінар групкамсоргаў. Абмяркоўвалі многа важных пытанняў камсамольскага жыцця — вучобу, грамадскую работу, выхаванне. Гэтыя пытанні цікавяць усіх: хутка сесія і да яе ўжо цяпер трэба старанна рыхтавацца. Камсоргі выказалі свае думкі, што ўжо зроблена імі на курсах, што перашкаджае лепш усвайваць праграму.

— Наш курс цяпер адзін з горшых на факультэце, — сказала Галіна Шмыгіна, камсорг другога курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры, — многія студэнты амаль не працуюць над павышэннем свайго культурнага ўзроўня, ёсць сярод іх выпадковыя людзі. Трэба больш прынцыпова адносіцца да прыёма абітурыентаў ва універсітэт.

Цікавую думку выказала камсорг трэцяга курса матфака Ларыса Расолька:

— На маю думку студэнты атрымліваюць двойкі з-за гультайства. Некаторыя выкладчыкі зніжаюць адзнакі за тое, што той ці іншы студэнт прапусціў лекцыю.

А камсорга трэцяга курса гістфака Уладзіміра Масюціна хвалюе пытанне аб становішчы навуковага сектара студэнтаў. Ён зазначыў, што некаторыя студэнты не хочуць займацца навуковай працай. Праўда многія з іх узялі тэмы па кафедры гісторыі КПСС. Але дэкан сказаў, што неабходна займацца па другой кафедры. Для навуковай работы зусім мала часу, вельмі многа грамадскіх даручэнняў.

У мінулым годзе нашы студэнты сабралі цікавыя матэрыялы аб удзельніках Вялікай Айчыннай вайны. Аддалі яго на кафедру гісторыі БССР, там паабяцалі выдаць зборнік. Але на абяцанні і спыніліся, бо наконт зборніка нічога не чуваць.

Толькі агульнымі сіламі можна ачысціць студэнцкі калектыў ад абібокаў і двоечнікаў. Таварыская выручка, узаемадапамога павінны займаць немалое месца ў групе.

Зусім па-другому падыходзяць да двоечнікаў на фізфаку. Камсорг 4-га курса гэтага факультэта адзначыў, што ў іх штодзённа падводзяцца вынікі наведвання лекцый, але дзейсных мер да прагульшчыкаў не прымаюць.

Не за гарамі сесія, студэнтам трэба часцей і часцей наведваць бібліятэкі і рыхтавацца да экзаменаў.

## Іскрынка

Ёсць на ўсходзе такі звычай — калі ты з'ясі ў доме знаёмага чаго-небудзь хоць кусочак, то становішся яго сябрам на ўсё жыццё. Па-мойму гэта вельмі добры звычай. Гутарка за сталом вельмі зближае людзей і пасля гэтага яны становяцца амаль роднымі. Прыкладна так і атрымалася на камсамольскім «Агеньчыку», які наладзілі студэнты трэцяга курса матфака. Зала сталовай, што па вуліцы Кастрычніцкай, у гэты вечар ператварылася ў залу дружбы, песен, смеха і радасці. Ініцыятыва наладзіць гэты вечар належыць усім, пагэтаму на яго сабраўся ўвесь курс. Спачатку былі танцы, пасля ў цішыні зазвінеў тонкі галасок Бэлы Пятрухінай. Яна чытала вершы. І, можа быць, іменна ў гэты момант, як ніколі, у яе паявілася пачуццё таварыскасці і сяброўства, на што звычайна трэба доўгія годы. Верагодна, у гэты момант «лёд крануўся», як сказаў бы Астап Бэндэр. Той лёд адчужальнасці, які так перашкаджае ўсім нам, таму што іменна пасля гэтага, калі пачаліся танцы, пайшлі танцаваць нават тыя, хто да гэтага часу ніколі не танцаваў. Яны не саромеліся іх жа вучылі свае. А пасля зноў гучалі песні і зноў пелі ўсе. Вядома, не ўсе пелі так жа прыгожа, як Марыя Козел, але хіба гэта мела якое-небудзь значэнне? Галоўнае тое, што пелі ўсе.

Гэты аганёк быў першым, але я веру, што ён разгарыцца ў полымя.

А. ТАБАЧНІКАЎ,
загадчык аддзела інфармацый.

## СЛАЎНЫ КУЛЯМЁТЧЫК

*Да 20-годдзя Вялікай перамогі*

Іхняму батальёну далі загад фарсіраваць раку, прыкрыць сваім агнём пераправу і забяспечыць падыход асноўных сіл. На штурм пайшоў батальён, а замацавалася на правым беразе толькі групка салдат. Сярод іх кулямётчыкі Дзмітрыя Жмуроўскага. Астатнія былі адсечаны шалёным варожым агнём. Смельчакі хутка акапаліся. Пачаўся няроўны бой. За плячыма — рака, наперадзе—фашысцкія штурмавікі, гарматы, мінамёты, кулямёты, пасярэдзіне — каля паўсотні байцоў.

— Падпусціць ворага бліжэй, берагчы патроны! — перадаў па ланцужку Дзмітрый Жмуроўскі...

Новы водны рубеж, і зноў першыя яго фарсіруюць кулямётчыкі на чале з Дзмітрыем Жмуроўскім. Скончыліся патроны — і ў ход пайшлі ручныя гранаты. У самы крытычны момант падаспелі падносчыкі, і зноў на плячах ворага смельчакі ўрываюцца на ашчэраную гарматамі і кулямётамі ўмацаваную вышыню. Паранены Жмуроўскі, але ісці ў санбат адмаўляецца наадрэз. Бой яшчэ не скончан.

...У адчыненае акно шпітальнай палаты ўрываецца лагодны вецер. Каторы ўжо тыдзень ляжыць прыкаваны да ложка Дзмітрый Жмуроўскі. А так хочацца ўстаць, падставіць насустрач ветру твар і дыхаць пругкім водарам. Але не ўстанеш, нават калі варухнешся, у скроні пачынаюць гухкаць цяжкія кавальскія молаты. Рана ў галаву— не жартачкі, ледзь ачуняў. Во толькі і можна працягнуць руку да тумбачкі, узяць шклянку. Што гэта! Нехта паклаў газету. Свежы нумар, перадалі яго кулямётчыкі! Цікава, як там на фронце, дзе цяпер яго кулямётчыкі. Пэўна, гоняць ворага. А ён во ляжыць. Позірк затрымаўся на Указах Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, спісах узнагароджаных, «Жмуроў-скі»... Прачытаў па складах і спачатку не зразумеў. Мо' нехта з братоў. І яны ж на фронце. Не, ён сам. Памылкі няма. «Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі» — ясна напісана. Гэта ж яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза!..

Сёння вы можаце сустрэць Дзмітрыя Пятровіча ў аўдыторыях універсітэта, на калідоры. Пройдзеце міма — і, магчыма, не заўважыце. Звычайны чалавек, як усе. Ніколі не выстаўляе сваё «я», заўсёды спакойны, ураўнаважаны. А калі і павысіць голас, дык толькі з-за кафедры, калі расказвае студэнтам пра нешта цікавае. Студэнты філалагічнага факультэта добра ведаюць, з якім захапленнем выкладае дацэнт Жмуроўскі гісторыю КПСС. Тут ён увесь, як на далоні,—ідэйны баец, камуніст, барацьбіт.

Пачнеш пытацца ў яго пра былыя паходы — толькі ўсміхнецца і адмоўваецца. А калі і расказжа што — то пра сваіх сяброў-кулямётчыкаў, падначаленых. Калі б не яны, маўляў, то не толькі ў героях не хадзіў бы, а і ўвогуле не давялося б пасля сканчэння вайны прыйсці на бераг роднага Дняпра і сказаць:

Мой родны кут, як ты
мне мілы!..

Затое, калі пачнеш гаворку пра яго доктарскую дысертацыю, тут адкуль красамоўства бярэцца ў чалавека! Пра новыя матэрыялы расказжа, пра архіўныя знаходкі, пра пошукі. Адразу бачыш чалавека, улюбёнага ў сваю справу.

Р. БУЛАЦКІ,
дэкан філалагічнага факультэта.

# СУСТРАКАЙ,

## ЦАЛІНААДА

ГОД 1959. 320 фізікаў МДУ прыехалі ў Булаяўскі раён Паўночна-Казахстанскай вобласці. Яны рапартавалі: пабудавана 12 дамоў, два птушнікі і кральчатнік.

ГОД 1960. У Казахстан прыбыло 500 будаўнікоў-студэнтаў. Выткарана — 1200 тысяч рублёў.

ГОД 1961. 1200 чалавек з маскоўскіх і ленінградцкіх Вузаў капітальна адрамантавалі 20 аб'ектаў, пабудавалі — 90.

ГОД 1962. Сіламі студэнтаў Масквы, Ленінграда і Кіева ўзведзена 619 дамоў, 183 вытворчых аб'екты.

ГОД 1963. У цалінным краі працавалі 16000 студэнтаў з 13 гарадоў Саюза, у тым ліку 2800 чалавек з Мінска, Гомеля, Віцебска. Выткарана 23 мільёна 700 тысяч рублёў.

ГОД 1964. У Казахстане працавала 30 тысяч студэнтаў з 39 гарадоў краіны. Было здана ў эксплуатацыю больш 3 тысяч кватэр, сотні грамадскіх і культурна-бытавых аб'ектаў.

ГОД 1965 Студэнтцкія атрады ў сваім саставе будуць мець 40 тысяч юнакоў і дзяўчат.

### ЦАЛІНАГРАДА УНІВЕРСІТЭТА

ГОД 1964. 320 студэнтаў фізічнага, гістарычнага, матэматычнага, юрыдычнага і філалагічнага факультэтаў у Чапаяўскім раёне Уральскай вобласці пабудавалі больш 50-ці аб'ектаў, выткарана сродкаў на суму 658 тысяч 240 рублёў.

ГОД 1965. Ва універсітэцкі будаўнічы атрад ўвойдзе 440.

## РЫХТУЙСЯ Ў ДАРОГУ, ТАВАРЫШ!

Стэп... Яшчэ нядаўна па яму імчалася перакаці-поле, адзінока цягнуліся да гарачага сонца жоўтыя, чырвоныя, белыя цюльпаны, бегалі суслікі, ды расцягнуўшы магутныя крыллі, кружылі ў безвоблачным небе арлы.

Прайшло каля дваццаці гадоў пасля першага клічу на цаліну. Гарачыя сэрцы, маладыя рукі разбудзілі, павярнулі тварам да жыцця звеку драмаўшую зямлю. Хто пабываў там, той сваімі вачыма бачыў хвалюючае мора пшаніцы, прыгажуні школы, стадыёны, спартыўныя пляцоўкі, піянерскія лагеры.

У гэтым годзе студэнты універсітэта ў трэці раз паедуць на цаліну. Трэцяе лета правядуць яны ва Уральскай вобласці. Як і раней, будзем будаваць грамадскія памяшканні, жылыя дамы, пракладваць водныя магістралі.

Ужо створан штаб працоўных спраў універсітэта, які займаецца камплектаваннем атрадаў. Узначалілі іх найбольш падрыхтаваныя студэнты, у прыватнасці, цаліннікі «старай гвардыі». Шырокі дыяпазон дзейнасці атрадаў: яны арганізуюць вучобу членаў атрадаў, прымаюць заявы, утрасаюць штодзённыя справы.

Сёлета фарміруецца ва універсітэце восем будаўнічых атрадаў, якія налічваюць у сваіх радах 440 юнакоў і дзяўчат. Тры атрады камплектуюцца са студэнтаў першага—трэцяга курсаў фізічнага факультэта, два атрады—матэматычнага, па аднаму атраду—юрыдычным, гістарычным і філалагічным факультэтамі. У кожным будаўнічым атрадзе налічваецца 50—60 чалавек са сваім кіраўніцтвам. Будуць створаны камсамольскія арганізацыі, партыйныя групы. Апрача работы, юнакі і дзяўчаты будуць удзельнічаць у выпуску насценных газет, у калектывах мастацкай самадзейнасці. Па прыезду на месца сфарміруюцца свае спартыўныя каманды, назначым лектараў, агітатараў, піянерважатых. Мы зможам таксама з мясцовай моладдзю праводзіць вечары адпачынку, канферэнцыі чытачоў, дыспуты.

Цаліна ў гэтым годзе ранняя. Ужо 15 чэрвеня мы выедзем з Мінска на ўсход, а першага верасня—на заняткі ва універсітэт.

Трэба цяпер адкласці ўсе справы і заняцца падрыхтоўкай да экзаменаў, якія адбудуцца ў маі—чэрвені месяцы. Калі ты сапраўдны цаліннік, то здасі паспяхова сесію. Ведай, што «двойка»,—чырвоны сігнал цаліне!

Цаліна кліча! Цаліна будуецца!

Таварыш студэнт! Уліваайся ў будаўнічыя атрады універсітэцкай камсамоліі!

В. ЧУМАКОЎ,
начальнік штаба

(З пастановы Цэнтральнага штаба студэнцкіх будаўнічых атрадаў).

Гарадскім і вузаўскім падрыхтоўчым штабам сумесна з камітэтамі камсамола і рэктарамі вузаў правесці старанную падрыхтоўку студэнтаў да работы на цаліне.

З гэтай мэтай:

— правесці персанальны адбор членаў атрада, абмеркаваць іх кандыдатуры на камсамольскіх сходах груп і курсаў, рэкамендаваць для паездкі на цаліну найбольш дастойных, добра паспяваючых, фізічна здаровых студэнтаў;

— шырока прапагандаваць падрыхтоўку атрадаў, аформіць у Вузах, на факультэтах стэнды, якія б расказвалі аб задачах атрадаў, асвятляць гэтыя пытанні ў шматтыражках і насценным друку.

— падрыхтаваць усіх членаў атрадаў да правядзення на цаліне прапагандысцкай, лекцыйнай і культурна-масавай работы. Пагэтаму — арганізаваць падрыхтоўку лектараў, прапагандыстаў, піянерважатых, кіраўнікоў школьных гурткоў, інструктараў па розных відах спорта, стварыць у саўгасных атрадах канцэртныя агітбрыгады, падрыхтаваць і перадаць мясцоваму насельніцтву бібліятэчкі, забяспечыць брыгады інвентаром, які неабходны для гэтай работы.

# ЗЯМЛЯ

## РАЗМОВА ЗАЙШЛА АБ СЕСІІ

Вясна, песня, цаліна... Гэтыя словы зраднілі маладосць рамантыка. У студэнцкіх кругах вакол іх толькі размова. Ледзь званок апавясціць перапынак, як шумныя калідоры напаўняюцца размовамі пра цаліну, пра тэрміновую здачу сесіі. Бывалыя цаліннікі між тым так і падмецяць:

— А як умеюць казахі гасцей баранінай частаваць. Пальчыкі абліжаш...

— Хутчэй бы чэрвень, — не тоіць свае думкі студэнт 1-га курса фізічнага факультэта Вася Астапчук, — заяву падаў — чакаю залічэння ў цалінны будаўнічы атрад. Як гэта здорава: будаваць, упрыгожваць жылымі карпусамі стэпавую зямлю.

— А як з сесіяй? — пацікавіўся ў Васі камсорг Барыс Татарынаў.

— Паедуць толькі выдатнікі.

— Будзем старацца.

У гэты час да хлопцаў падыйшоў Эдуард Васюцёнак. Яму ёсць што расказаць, чым падзяліцца. Два гады быў на цаліне і сёлета зноў паедзе.

— Спадабалася, — усміхаецца Эдуард Васюцёнак,— памужнееш, сілы набярэшся. Затым вучоба ідзе спарней.

Гутарка заходзіць пра заняткі, пра падрыхтоўку да сесіі. Эдуард разам з сваімі сябрамі па цаліне Мікалаем Кучынскім і Яўгенам Васілеўскім раяць, як лепш скампанаваць рабочы дзень, на што звярнуць галоўную ўвагу:

Трэба ўлічваць кожную хвіліну, кожную гадзіну з тым, каб працаваць прадукцыйна, эфектна. Вучоба перш за ўсё! Больш часу трэба праводзіць у лабараторыях, чытальных залах, бібліятэках. А не зразумеў што — не адкладвай назад, а адразу старайся ўразуміць невядомае. Толькі праца, творчая і самаадданая прыносіць жаданы поспех.

Фактычна асаблівых змен у арганізацыі студэнцкага будаўнічага семестра не адбылося. У мінулыя гады ён пачаўся з 10 ліпеня і закончваўся ў канцы верасня. Вярнуўшыся ў ВУЗ, студэнт-цаліннік павінен быў наварстаць упушчанае і разам з усімі здаваць зімовую сесію. Сёлета, наадварот. Трэба на месяц раней здаць летнюю сесію. Затое заняткі наступнага курса пачнуцца своечасова.

...Зазвінеў званок. Перамена закончылася. Калідоры апусцелі, прыціхлі. Прыціхлі і студэнты ў аўдыторыях, каб лепш падрыхтавацца да сесіі, паспяхова здаць экзамены. Пройдзе час і зашумяць ужо не калідоры і не аўдыторыі. Зашумяць цалінныя прасторы ад вясёлых галасоў студэнтаў, удараў малаткоў, гула матораў, задорных песен.

Ул. ВЯЛІЧКА.



НА ЗДЫМКУ: студэнты-журналісты пішуць заяву на цаліну.

Фота Ул. Вялічка.

## Разведка выйшла на заданне

Па цаліне ідзе вясна. З кожным днём становіцца ўсё цяплей і цяплей. Цаліна рыхтуецца да новага сельскагаспадарчага года. Пройдзе некалькі тыдняў і чорнай стужкай за плугам пацягнецца ўрадлівая зямля, лягуць у чарназём першыя зёрны залатой пшаніцы.

Хутка лягуць азёры і ў ворыва студэнцкай цаліны. У саўгасы Казахстана паляцелі першыя «ластаўкі» — разведчыкі 40-тысячнага атрада студэнтаў краіны. Сярод іх і чатыры нашых пасланцы: Іван Цвірко, студэнт фізфака, былы камандзір атрада — сцяганосца «Аэліта»; Уладзімір Пташнікаў, студэнт юрфака, член атрада «Феміда»; студэнты-матэматыкі Міхаіл Трацьяк і Анатоль Бяссонаў. Перад «разведчыкамі» пастаўлена баявое заданне. Яны павінны разузнаць будучыя «плацдармы», вызначыць аб'ёмы работ, заключыць дагаворы з гаспадаркамі. Яны размясцяць маршруты будучых арбіт, на якія выйдуць цалінныя атрады. Усе дэталі павінны прадугледзець нашы пасланцы! Гэта вялікая і адказная задача, ад якой у многім залежаць будучыя вынікі.

«Разведчыкі выехалі на заданне. Неўзабаве пачне і наступленне будаўнічы семестр 1965 года. Рыхтуйся да яго, сябра! Эшалон адыходзіць першага чэрвеня. Другога эшалона не будзе...

М. ЛАТЫШ.

## ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ

1. Начальнік штаба — Васіль Чумакоў (4 курс фізфак);
2. Адказны за палітыка-выхаваўчую работу — Валерый АНОСАЎ (1 шурс філфака);
3. Загадчык гаспадаркі — Эдуард ВАСЮЦЁНАК (3 курс фізфака);
4. Намеснік начальніка штаба — Анатоль СКАЧОК (3 курс матфака);
5. Адказны за арганізацыйны сектар — Іван СТАДУБ (3 курс гістфака);
6. Намеснік загадчыка гаспадаркі — Іван ЦВІРКО (3 курс фізфака);
7. Загадчык агітацыйнага сектара — Міхась ВАЛЧОК (2 курс юрфака);
8. Член штаба — Анатоль АЛЯШКЕВІЧ (2 курс матфака).

Камандзіры атрадаў:

1-га курса фізікаў — Мікалай КУЧЫНСКІ;

2-га курса фізікаў — Іван ЦВІРКО;

3-га курса фізікаў — Яўген ВАСІЛЕЎСКІ;

юрыстаў — Міхась ВАЎЧОК;
гісторыкаў — Іван СТАДУБ;
1-га курса матэматыкаў — Анатоль АЛЯШКЕВІЧ;

філолагаў — Васіль КОШМАН.

Рэдактар П. СІЛІВАНЧЫК.

# ЦАЛІННАЯ!

АТ 06535 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус 212. Тэл. 2-07-19. Друкарня Выдавецтва «Звязда» Тыр. 2000. Зак. 410.